2. Кажухоўская, Л.С. Сімвалы гарманізацыі космасу беларусаў / Искусство и культура: научно-практический журнал // учредитель учреждение образования «Витебский государственный университет имени П.М. Машерова». – 2014. – № 3. – С. 56-60.

3. Кацар, М.С. Беларускі арнамент: Ткацтва. Вышыўка ⁄ М. С. Кацар; пер. з рус., літ. апрац. і навук. рэд. Я. М. Сахуты. – Мінск: БелЭн, 1996. – С.17.

4. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы). – Мн. : Маст. літ., 2000. – 400 с.

**Ліпінская Н.С.,** студэнт
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.

## АБ ДЭФІНІЦЫІ ПАНЯЦЦЯЎ “МАСТАЦКІ ВОБРАЗ” І “МАСТАЦКАЯ ВОБРАЗНАСЦЬ”

На наш погляд разгляд гэтага пытання неабходна ажыццявіць са значэння паняцця ―мастацкі вобраз", паколькі ў літаратуры ён распрацаваны больш дакладна ў параўнанні з іншымі.

На думку рэжысёра П. А. Гуда – ―мастацкі вобраз – гэта асаблівы спосаб адлюстравання жыцця, характэрны толькі для мастацтва. Гэта рэчаіснасць перапрацаваная творчай фантазіяй мастака і ўвасобленая ў метафарычнай форме".

Мастацкі вобраз нараджаецца ўяўленнем творцы пад уплывам моцна адчутага ўражання ці больш пільнага мастацкага бачання з‘яў жыцця і прыроды. Гэта ўласціва мастацкі адораным натурам, якія адчуваюць тое, што часам не даступна простаму позірку. Моцна адчутае і заўважанае мастак увасабляе ў ствараемым ім творы, у той ці іншай матэрыяльная форме (пластычнай, гукавай, жэста – мімічнай, моўнай) і пасля гэтае матэрыялізаванае мастацтвам пачуццё, узнаўляецца ва ўяўленні, успрымаючага яго, гледача,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытача ці слухача. Такім чынам, мастацкі вобраз – гэта не простае механічнае ўвасабленне таго, што мастак убачыў, пачуў ці пазнаў. Гэта стварэнне яшчэ адной рэчаіснасці пры дапамозе гукаў і слоў, ліній і колераў, аб‘ёмаў і форм у музыцы, літаратуры, жывапісу,скульптуры, архітэктуры і іншых відах мастацкай дзейнасці. [2, с. 204].

Найбольш грунтоўна паняцце ―мастацкі вобраз" разглядаецца у літаратуры. Ён ўяўляе сабой не толькі малюнак чалавека (вобраз Сымона Музыкі), а таксама з'яўляецца карцінай чалавечага жыцця, у цэнтры якой стаіць канкрэтны чалавек. Вобраз – характар героя, у літаратуры складаецца паслядоўна, вабраўшы ў сабе ўсё то, што ён казаў ці рабіў на працягу сюжэта. Так, у мастацкім творы чалавек малюецца ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі. Таму тут можна казаць не аб адным вобразе, а пра мноства вобразаў.

У адрозненні ад літаратуры, выяўленчае мастацтва не можа перадаць рух і развіццё ў часе, але і тут ёсць свая сіла, сваё разуменне мастацкага вобраза. У гэтай абмежаванасці жывапісу ёсць свае магчымасці, недаступныя іншым мастацтвам. У жыцці бесперапынна ўзнікаюць моманты, палажэнні, якія нам хацелася б спыніць, утрымаць назаўжды. Маляўнічы вобраз валодае непараўнальна больш шырокай і значнай жыццёвай і эстэтычнай каштоўнасцю; ён толькі на першы, павярхоўны, погляд здаецца выявай якога - небудзь аднаго моманту, на самой жа справе мастацкі вобраз ёсць вынік абагульнення жыцця, сінтэз многіх момантаў, падобных намаляваным у карціне.

У музыцы мастацкі вобраз вызначаецца сукупнымі, узгодненымі сродкамі ўсіх элементаў музычнай мовы, яе інтанацыйна-меладычным ладам, выразнымі асаблівасцямі метра, рытму, тэмпу, лада, гармоніі, дынамічных адценняў, а таксама ўнутраным будынкам, кампазіцыяй кожнага музычнага твора. Сутнасць музычнага вобраза сканцэнтравана ў мелодыі і цалкам можа хавацца нават у аднагалосныя мелодыі ці найгрышы. Музыка як жывое мастацтва нараджаецца і жыве ў выніку аб‘яднання ўсіх відаў дзейнасці.

Зносіны паміж імі адбываюцца праз музычныя вобразы. У свядомасці кампазітара пад уздзеяннем музычных уражанняў і творчага ўяўлення

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зараджаецца музычны вобраз, які затым ўвасабляецца ў музычным творы. Адсюль зразумела, што калі твор не мае вобразаў тады і музыка, як від мастацтва перастае існаваць.

Что тычыцца тэатральнага мастацтва, то можна выкарыстоўваць думкі і разважанні знакамітых рэжысёраў, такіх як К.Станіслаўскі, В.Нямiровіч – Данчанка, В.Вахтангаў і інш., а таксама некаторых сучасных даследчыкаў І. Шароеў, Чарняк, Маісейчук, наконт паняцця ―мастацкі вобраз".

Так, Я. Б. Вахтангаў трактуе вобразы як сімволіку і алегорыю, лімітавую схематызацыю, маску, трагічны гратэск пазбаўлены канкрэтнасці.[1, с.111].

К.С. Станіслаўскі адзначаў характэрныя асаблівасці вобраза ў рэчаіснасці: ―Вобразы павінны быць у тыповых і жыццёвых рысах, і чым болей тыповы вобраз, тым ён болей жывы і праўдзівы". [3, с.110]. На яго думку ўчынкі і жаданні павінны адлюстроўваць інтарэсы, намеры і пачуцці сутнасць якіх збірае мастак у цэласнае і арганічнае стварэнне - мастацкі вобраз. На рэпетыцыях К.С. Станіслаўскі прапаноўваў акцёрам зрабіць ―галерэю вобразаў". У процівагу В.І. Нямiровіч – Данчанка адрэагаваў на гэту ідэю вельмі скептычна: ―Мне гэта не трэба! Мне патрэбна класічная прастата і адзінае магчымае тлумачэнне вобраза". [4, с. 59]. Такім чынам, у тэатральным мастацтве стаўленне да такой з'явы як ―мастацкі вобраз" мае паліфанічную разнастайнасць трактавання.

На жаль паняцце ―мастацкая вобразнасць" у літаратуры разгледжана недастаткова. На нашу думку, ў святочнай культуры беларусаў, у тым ліку ў цырымоніях дзяржаўных узнагарод Рэспублікі Беларусь, яна ўвасабляецца даволі актыўна і выступае як комплекс вобразаў. Справа ў тым, што ў цырымоніі выкарыстоўваюцца разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці: музыка, пластыка,асвятленне,дэкаратыўнае афармленне, слова і інш. Кожны з гэтых мастацкіх сродкаў з'яўляецца сінтэтычным кампанентам мастацтва, утвараючы комплекс мастацкіх вобразаў, якія і складаюць мастацкую выразнасць цырымоній.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Лічым неабходным раскрыць спецыфіку дзяржаўных цырымоній. Яны з‘яўляюцца неад‘емнай часткай святочнай культуры Беларусі і выконваюць важнейшую функыянальную ролю. Можна вылучыць асноўныя функцыі цырымоній: рэпрэзінтатыўная, грамадска – палітычная і культурна – асветніцкая.

Сярод гэтых функцый галоўнай з‘яўляецца грамадска – палітычная, бо яна накіравана на захаванне добрых адносін паміж краінамі, павагі да замежных гасцей і візіцёраў. Рэпрэзентатыўная функцыя накіравана на паказ, дыманстрацыю дзяржаўнай палітыкі праз цырымоніі і рытуалы. І апошняя, культурна – асветніцкая функцыя – праяўляецца ў сэнсавым напаўненні дзяржаўных цырыманіялаў, якая ўплывае на погляды людзей праз мастацкае аздабленне цырымоній.

На сённяшні дзень дзяржаўныя цырымоніі Рэспублікі Беларусь уключаюць у сабе дзве асноўныя часткі: пратакольную і мастацкую. Пратакольная частка – гэта афіцыйнае мерапрыемства, у якім удзельнічае прадстаўнік улады са строга зафіксаванымі дзеяннямі і рытуаламі. Яна азначае сукупнасць правіл, у адпаведнасці з якімі рэгулюецца парадак розных цырымоній.

Што тычыцца пратакольнай часткі цырымоній, то ў ёй мастацкая вобразнасць носіць абмежаваны характар. Яна праяўляецца ў сціплай форме мастацкіх сродкаў: дыпломы і ўручэнне кветак пераможцам, прамовы прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі, словы Мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Патрыяршага экзарха ўсея Беларусі, нацыянальнае адзенне тых, хто дапамагае ў дзеі і інш.

Найбольш грунтоўна мастацкая вобразнасць праяўляецца ў другой частцы цырымоніі, якая носіць канцэртны характар. Ён з‘яўляецца ўвавсабленнем канкрэтнай тэмы і ідэі, прымеркаванай да цырымоніі. У канцэрце прымаюць удзел лепшыя дзяржаўныя калектывы і асобныя выканаўцы, майстры розных жанраў. Пры гэтым мастацкая вобразнасць праяўляецца як у агульным настроі канцэртнай праграмы, так і ў асобных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нумарах, у залежнасці ад накіраванасці канкрэтнай цырымоніі. Так, у цырымоніі, прысвечанай уручэнню прэміі ―За духоўнае адраджэнне” мастацкая вобразнасць увасаблялася ў ―зорках”, якія ўвасаблялі сабой дзяцей, нашу будучыню.

У заключэнні зробім наступныя абагульненні. Паняцці ―мастацкі вобраз”, ―мастацкая вобразнасць” не з‘яўляюцца аналагічнымі. Кожнае з іх мае канкрэтныя асаблівасці і праяўляецца ў мастацтве па рознаму, у залежнасці ад гістарычнага часу, ідэйнай накіраванасці, нарэшце, індывідуальных асаблівасцей мастака, літаратара, музыканта, рэжысёра. У цырымоніі мастацкая вобразнасць увасабляецца канкрэтна, таму, што прысвечана дакладнай дзяржаўнай падзеі, звязанай з уручэннем дзяржаўных узнагарод лепшым прадстаўнікам разнастайных прафесій. У той жа час яна ўяўляецца як комплекс разнастайных мастацкіх вобразаў, аб‘яднаных адзінай ідэяй.

На нашу думку, неабходна акрэсліваць спецыфіку ўспрыняцця мастацкай вобразнасці канкрэтным суб‘ектам, у залежнасці ад яго светаўспрымання, інтэлекта, мастацкага бачання і інш. Акрамя адзначанага вышэй, цырымонія, дзякуючы мастацкай вобразнасці, успрымаецца гледачом не проста як афіцыйнае мерапрыемства, а як мастацкая падзея, у якой увасобіліся разнастайныя мастацкія сродкі і вобразы.

---


1. Зверева, Н.А., Ливнев Д.Г. Словарь театральных терминов (создание актёрского образа). 2 – е изд. М.: Российский университет театрального искусства – ГИТИС, 2014. – 136 с.[111] с.

2. Пави, П., Словарь театра: Пер.с фр. – М.: Прогресс, 1991. – 504 с.: ил. [204] с.

3. Полякова, Е., Станиславский – актёр / [Ин – т истории искусств М – ва культуры СССР]. – М.: [«Искусство»], 1972. – 430 с. С факс.: 41 л. Ил. [110] с.

4. Черкасский, С., Мастерство актёра: Станиславский – Болеславский – Страсберг: история, теория, практика / Сергей Черкасский. – Санкт – Петербург : Издательство РГИСИ, 2016. – 814,[1] с. [59] с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ